***"Польска-амерыканскі фонд свабоды"*** *быў створаны "Польска-амерыканскім фондам прадпрымальніцтва" ў 1999 г. Місія фонду палягае на ўзмацненні грамадзянскай супольнасці, дэмакратыі і рыначнай эканомікі ў Польшчы, пашырэнні роўнасці шанцаў на індывідуальнае і грамадскае развіццё, дзяленні польскім досведам трансфармацыі з іншымі краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Уласную місію фонд ажыццяўляе, дзякуючы рэалізацыі праграмаў па чатырох напрамках: ініцыятывы ў галіне адукацыі, развіццё лакальнай супольнасці, грамадзянін у дэмакратычнай прававой дзяржаве і распаўсюджванне польскага досведу трансфармацыі. Праграмы накіраваныя, галоўным чынам, да асяроддзя вёсак і малых мястэчак.*

**http://www.pafw.pl**

KOLEGIUM EUROPY WSCHODNIEJ Fundacja im. Jana Nowaka - Jeziorańskiego

***Калегія Усходняй Еўропы імя Яна Новака-Езяраньскага*** *- гэта няўрадавая арганізацыя, заснаваная ў 2001 г. Яе місіяй з'яўляецца пабудова мастоў супрацоўніцтва паміж народамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Мэта дзейнасці Калегіі, у прыватнасці, - адукацыя лідэраў палітычнага, эканамічнага і грамадскага жыцця ў рамах адукацыйных, навуковых, культурных, эканамічных і выдавецкіх праграмаў. Калегія ладзіць міжнародныя стажыроўкі і моладзевы абмен дзеля ўзаемнага вывучэння маладых асобаў, якія жывуць на тэрыторыі ЕС і па-за яго межамі.*

**http://www.kew.org.pl**

FUNDACJA BORUSSIA OLSZTYN

***Фонд „Borussia"*** *створаны ўвесну 2006 г. Ён працягвае і падтрымлівае дзейнасць, распачатую ў 1990 г. Таварыствам "Культурная супольнасць «Borussia»". Мэтай фонду з'яўляецца пабудова і паглыбленне культуры дыялогу і талерантнасці паміж асобамі розных нацыянальнасцей, веравызнанняў, традыцый, а таксама ўдзел у стварэнні на Варміі і Мазурах грамадзянскай супольнасці. „Borussia" вядзе адукацыйную і культурную дзейнасць для моладзі і дарослых, ладзіць семінары, курсы, канферэнцыі, лекцыі, літаратурныя вечарыны. Вядзе ўласнае выдавецтва.*

**http://www.borussia.pl**

***Фонд "Адукацыя для дэмакратыі"*** *быў заснаваны напрыканцы 80-х гадоў, дзякуючы супрацоўніцтву польскіх і амерыканскіх педагогаў. Мэтай фонду з'яўляецца распаўсюджванне ведаў аб дэмакратыі і рыначнай эканоміцы, а таксама - здольнасцей грамадзянскіх дзеянняў у дэмакратычнай краіне. Галоўнае заданне фонду - гэта дапамога ў дадзенай галіне настаўнікам, выхавацелям, супрацоўнікам няўрадавых, прафсаюзных і моладзевых арганізацый, а таксама - структурам самакіравання ў Польшчы і іншых краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.*

**http://www.edudemo.org.pl**

***Праграма "Змены ў рэгіёне"- RITA ("Region in Transition")*** *- гэта ініцыятыва "Польска-амерыканскага фонду свабоды", якую ажыццяўляе фонд "Адукацыя для дэмакратыі". Мэта праграмы палягае на падтрымцы дэмакратычных і рыначных змен у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, перш за ўсё, шляхам перадачы польскага досведу.*

***Праграма ажыццяўляецца, дзякуючы:***

- *падтрымцы праектаў польскіх няўрадавых арганізацый і адукацыйных устаноў, прэзентуючых працэсы сістэмнай трансфармацыі ў Польшчы;*
- *усталяванню партнёрскага супрацоўніцтва паміж няўрадавымі арганізацыямі, адукацыйнымі ўстановамі і структурамі тэрытарыяльнага самакіравання з Польшчы і замежжа;*
- *дакладнаму інфармаванню аб дзейнасці польскіх няўрадавых арганізацый рэгіёну; падтрымцы іх дзейнасці па-за межамі Польшчы;*
- *функцыянаванню платформы па абмене інфармацыяй паміж арганізацыямі і інстытутамі грамадзянскай супольнасці ў Польшчы, Еўрапейскім Саюзе, Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.*

**http://www.edudemo.org.pl/rita**

***У рамах праграмы "RITA" ў 2004 годзе паўстала ініцыятыва "Study Tours to Poland" (STP), адрасаваная дзвюм групам: прафесіяналам і студэнтам. На сённяшні дзень STP кіруе Калегія Усходняй Еўропы імя Яна Новака-Езяраньскага. Студэнцкае STP каардынуе Фонд „Borussia".***

**http://www.studytours.pl**

Polsko-Amerykańska Fundacja Wolności

Polish-American Freedom Foundation

# STUDY TOURS TO POLAND

## студэнцкія навучальныя візіты



# STUDY TOURS TO POLAND

***“Польска-амерыканскі фонд свабоды”, Калегія Усходняй Еўропы імя Яна Новака-Езяраньскага, фонд „Borussia” і фонд “Адукацыя для дэмакратыі” запрашаюць актыўных студэнтаў з Беларусі, Украіны і Расейскай Федэрацыі (Калінінградская вобласць, Ленінградская вобласць і горад Санкт-Пецярбург, Наўгародская вобласць ) на стажыроўку ў Польшчу!***

*У рамах інтэнсіўнага, двухтыднёвага побыту ў Польшчы, каардынаванага дасведчанымі грамадскімі арганізацыямі, удзельнікі змогуць:*

- *пазнаёміцца з дзейнасцю польскіх акадэмічных цэнтраў, даведацца аб працы грамадскіх арганізацый,*
- *сустрэцца з выдатнымі грамадскімі дзеячамі Польшчы,*
- *прыняць удзел у лекцыях, семінарах, курсах, культурных мерапрыемствах.*

*Праграма забяспечвае поўнае ўтрыманне ўдзельнікаў падчас візіту ў Польшчы, у тым ліку, пражыванне, харчаванне і навучанне, а таксама аплату праезду і спрыянне ў атрыманні візы.*

***Валоданне польскай мовай не з'яўляецца абавязковай умовай удзелу ў праграме.***

## Кандыдаты:

***У праграме “Study Tours to Poland” могуць прыняць удзел студэнты:***

- *ва ўзросце ад 18 да 21 года (якім да 15 снежня не споўніцца 22 гады), якія навучаюцца ў Беларусі, Украіне і Расейскай Федэрацыі (у Калінінградскай вобласці, Ленінградскай вобласці і ў горадзе Санкт-Пецярбургу, Наўгародскай вобласці) і з'яўляюцца грамадзянамі гэтых краін;*
- *з высокімі паказчыкамі паспяховасці, якія актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці.*

***Заявы, якія не адпавядаюць вышэйпералічаным патрабаванням, не будуць разглядацца.***

## Конкурс

***Падача заяўкі на ўдзел у праграме:***
*кандыдаты падаюць заяўкі на ўдзел у праграме, індывідуальна дасылаючы неабходныя дакументы па электроннай пошце. Заявы разглядаюцца спецыяльна створанай адборачнай камісіяй “Польска-амерыканскага фонда свабоды”.*

### НЕАБХОДНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

- *запоўнены фармуляр заяўкі (Excel),*
- *эсэ на тэму “Чаму я хачу прыехаць у Польшчу?” (1 старонка, 1800 сімвалаў),*
- *залучаныя файлы фармату PDF, Word ці JPG (адсканаваныя ці сфатаграфаваныя):*

*1. рэкамендацыйны ліст, напісаны кіраўніком, лідэрам грамадскай арганізацыі, начальнікам, выкладчыкам і да т. п.,*

*2. ксеракопія пашпарта (старонка з дадзенымі кандыдата),*

*3. ксеракопіі заліковай кніжкі - старонка за апошні навучальны год (у выпадку першакурснікаў - ксеракопіі атэстата).*

***Фармуляр заяўкі знаходзіцца на сайце:***
***http://www.studytours.pl***

***Заяўкі кандыдатаў прымаюцца выключна па электроннай пошце па адрасе:***

***nabor2010@studytours.pl***

*Калі ласка, дасылайце заяўку з усімі дадаткамі ў адным лісце!*

*Дакументы павінны быць падрыхтаваныя ў адпаведнасці з “Інструкцыяй па запаўненню заяўкі”.*

***Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па адрасе:***
***nabor2010@studytours.pl***

*Бліжэйшы тэрмін падачы заявак завяршаецца:*
***15 снежня 2009 г.***

***Заявы, атрыманыя пасля гэтай даты, не будуць разглядацца.***

## ВЫНІКІ КОНКУРСУ

*Кандыдаты атрымаюць паведамленне аб выніках конкурсу па электроннай пошце пасля* ***25 студзеня 2010 г.***

***Час правядзення стажыровак - красавік, травень 2010 г.***

***Працэдура падачы заявак на ўдзел у праграме бясплатная!***

